П. К. ПАНАМАРЭНКА
Сакратар ЦК КП(б) Беларусі

# Таржаство беларускага вызваленага народа

Толькі шэсць месяцаў прайшло з таго часу, калі доблесная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія вызваліла Заходнюю Беларусь ад прыгнятальнікаў. Толькі пяць месяцаў прайшло з часу незабываемых дзён Народнага Сабрання, якое выразіла адзіную волю народа Заходняй Беларусі аб устанаўленні савецкай улады і з'яднанні беларускага народа ў адзінай Беларускай дзяржаве, у саставе вялікага Савецкага Саюза.

Які кароткі тэрмін, а якія велізарныя змены адбыліся ў эканоміцы, культуры, быце народа! Згодна волі Народнага Сабрання зямля знаходзіцца ў руках тых, хто на ёй працуе,—у сялян. Фабрыкі, заводы і банкі сталі грамадскім здабыткам. У органах улады — саветах, у сялянскіх камітэтах знаходзяцца прадстаўнікі народа.

Ва ўсіх вугалках заходніх абласцей Беларусі кіпіць велізарная творчая работа. 20 тысяч працоўных, паказваючы ўзоры стаханаўскай працы, будуюць Днепра-Бугскі канал, рэканструіруючы важнейшую водную магістраль. Многатысячная армія будаўнікоў прыступае да аднаўлення другой воднай магістралі — Днепра-Нёманскага (Огінскага) канала. Рабочыя ў горадзе Гродна рэканструіруюць веласіпедны завод, імкнучыся давесці выпрацоўку да 50 тыс. веласіпедаў у год. Запалкавая фабрыка ў Пінску дае 1.500 скрынак запалак штодзённа. Аднаўляюцца заводы сельгасмашын у Ломжы і Лідзе. Ужо ў гэтым годзе яны выпусцяць 2,5 тыс. малатарань, каля 1.000 веялак, 13 тыс. саламарэзак, 1.000 ільнатрапалак. У бліжэйшы час уступіць у строй цэлы рад новых прадпрыемстваў. Расшыраецца абутковая фабрыка, былая «Ардаль», у Лідзе. Фабрыка ў гэтым годзе выпусціць вялікую колькасць рознага абутку і 540 тыс. пар галош. Аднаўляюцца тэкстыльныя фабрыкі ў Беластоку. Лік рабочых тэкстыльшчыкаў павялічыўся на 4 тыс. чалавек.

Расце і шырыцца стаханаўскі рух, ламаючы старыя погляды на працу. Беластоцкія тэкстыльшчыкі высунулі лозунг зрабіць савецкі Беласток другім Іванавым. Ужо ў гэтым годзе рэканструіраваныя фабрыкі Беластока выпусцяць каля 10 мільёнаў метраў высокаякаснай тканіны. Ажыла лясная прамысловасць, якая ўжо ў гэтым годзе дасць 4.100 тысяч кубаметраў драўніны. Пачалі працаваць раней законсерваваныя фанерныя заводы, арганізуецца лесахімічная прамысловасць, разгорнута будаўніцтва буйнага папярова-цэлюлёзнага камбіната.

Заходнія абласці Беларусі маюць ужо ў 1940 г. свой першы народнагаспадарчы план, які з'яўляецца ілюстрацыяй велізарных клопатаў партыі Леніна—Сталіна аб краі, аб беларускім народзе. Гэты план, апрача сказанага вышэй, прадугледжвае аднаўленне разбураных бамбардыроўкай гарадоў, будаўніцтва школ, рэканструкцыю вадаправодных і каналізацыйных сетей, поўнае аднаўленне і расшырэнне тэлефоннай і тэлеграфнай сувязі, расшырэнне электрастанцый у Беластоку, Гродне, Брэсце і другіх.

Сотні тысяч беззямельных і малазямельных сялянскіх гаспадарак атрымалі зямлю, якая раней належала польскім магнатам і памешчыкам Радзівілам, Сапегам, Тышкевічам і другім. Сотні тысяч гектараў пахатнай зямлі атрымалі былыя батракі, беднякі і малазямельныя серадцякі, не лічачы выпасаў і сенакосных угоддзяў. Звыш 25 тыс. бескароўных і 10 тыс. бясконных гаспадарак надзелены каровамі і коньмі. У дапамогу сялянам накіроўваюцца аграномы, тэхнікі, ствараюцца кузні для рамонту сельскагаспадарчага інвентара.

**Сяляне заходніх абласцей Беларусі актыўна рыхтуюцца да першай савецкай вясны, ачышчаюць насенне і рыхтуюць сельскагаспадарчы інвентар і збрую, вывозяць гной на палі, дагаварваюцца аб** узаемнай дапамозе ў пахаце, аб узаемнай дапамозе насеннем. У сёлах арганізавана каля 1.000 зернеачышчальных пунктаў і перасоўных абозаў для ачысткі насення. Да вясновай сяўбы ў сёлы заходніх абласцей рэспублікі завозіцца многа сельскагаспадарчага інвентара: звыш 2.000 конных плугоў, 1.500 культыватараў, каля тысячы сеялак, сенакасілак, жатак і т. д.

Велізарную палітычную актыўнасць сялян характарызуе жаданне многіх з іх арганізаваць калектыўныя гаспадаркі. Найбольш перадавыя сяляне, беднякі і серадцякі, глыбока разумеючы шляхі сацыялістычнага будаўніцтва ў вёсцы, вучачыся на прыкладзе вялікага Савецкага Саюза, выступаюць застрэльшчыкамі стварэння калгасаў і ствараюць іх. У некаторых выпадках заявы з просьбай арганізаваць калгасы сяляне падаюць цэлымі вёскамі. У Мастоўскім раёне, Баранавіцкай вобласці, у вёсцы Курылавічы з 104 гаспадарак, пражываючых у вёсцы, заявы аб уступленні ў калгас падалі 95 гаспадарак. У вёсцы Вайнілавічы, гэтага-ж раёна, з 102 гаспадарак — 98. У вёсцы Чудзіна, Ганцэвіцкага раёна, Пінскай вобласці, з 319 гаспадарак у калгас уступілі 293. У Пружанскім раёне, Брэсцкай вобласці, з 9.000 гаспадарак 2.428 падалі заявы аб уступленні ў калгасы. Да гэтага часу ў заходніх абласцях арганізавана 149 калгасаў, якія аб'ядноўваюць 9.856 гаспадарак.

Сяляне надзвычай сур'ёзна падыходзяць да арганізацыі калгасаў. Як правіла, пасля рашэння схода сяляне зараз-жа прыступаюць да абагулення цяглавай сілы, насення, сельскагаспадарчага інвентара. **Партыйныя і савецкія арганізацыі аказваюць вялікую дапамогу калгаснаму будаўніцтву, наглядаючы за строгім захаваннем прынцыпа добраахвотнасці і не дапу-**